# ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ ГОСУДАРСТВА И ПРАВА

**УДК 347.961(476)"1917/1991"**

## РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖАЎНАГА НАТАРЫЯТА БЕЛАРУСКАЙ ССР У 1950-Я ГАДЫ

***У.М. АНГЕЛЬСКІ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Даследуецца развіццё дзяржаўнага натарыята Беларускай ССР у 1950-я гады. Аналізуюцца шматлікія архіўныя крыніцы і акты заканадаўства таго часу, якія рэгулююць арганізацыю і дзейнасць органаў дзяржаўнага натарыята, вывучаецца практыка іх прымянення. Даецца характарыстыка прававога і сацыяльнага статусу савецкіх натарыусаў. Разглядаецца кампетэнцыя, кадравае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэння дзяржаўных натарыяльных кантор, высяняюцца колькасць, структура і якасць выкананых натарыяльных дзеянняў.*

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у артыкуле 2 замацавала, што "чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы" [1]. У прававой сістэме беларускай дзяржавы асаблівае месца ў абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб, дзяржаўных інтарэсаў належыць натарыяту. У Рэспубліцы Беларусь у 2011 годзе аказывалі паслугі насельніцтву 815 дзяржаўных натарыусаў у складзе 208 дзяржаўных натарыяльных кантор і 47 прыватных натарыусаў. Колькасць здзейсненых натарыяльных дзеянняў у 2011 годзе ў параўнанні з 2010 годам павялічылася на 12,4 % і склала больш за 1,2 млрд. У дзяржаўны бюджэт паступіла звыш 37 млрд. беларускіх рублёў дзяржаўнай пошліны [2, с. 8].

Істотнай характарыстыкай сучаснага заканадаўства аб натарыяце з'яўляецца яго пастаяннае развіццё. У прыватнасці, 20 лістапада 2011 года ўступіў у сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Белаусь ад 11 жніўня 2011 года № 366 "Аб некаторых пытаннях натарыяльнай дзейнасці", які ўдасканаліў парадак задавальнення бясспрэчных патрабаванняў грамадзян і юрыдычных асоб [3].

У сувязі з вышэйсказаным, актуальнымі становяцца навуковыя даследаванні гісторыка-прававых аспектаў узнікнення і развіцця інстытута натарыята. Дадзеныя распрацоўкі павінны стаць асновай для далейшага рэфармавання арганізацыі і дзейнасці натарыята.

Дзейнасць дзяржаўнага натарыята Беларускай ССР, прыпыненая ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, была ўзноўлена ў другой палове 1940-х гадоў. У пачатку 1950-х гадоў пачаўся новы перыяд у развіцці дзяржаўнага натарыята, які працягваўся да 1960 года, калі было ліквідавана Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР [4]. У дадзены перыяд у заканадаўства аб дзяржаўным натарыяце неаднаразова ўносіліся змяненні і дапаўненні. Пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР у 1950 годзе было зацверджана чарговае Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР і адначасова прызнана страціўшым сілу Натарыяльнае палажэнне Беларускай ССР ад 4 снежня 1929 года [5, л. 86 – 103]. Прыняцце Палажэння аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР № 702 ад 7 чэрвеня 1950 года было значным крокам у развіцці натарыяльнага заканадаўства, так як гэта першы прававы акт, у якім былі аб'яднаны нормы, якія рэгулявалі як арганізацыю, так і дзейнасць дзяржаўнага натарыята. У гэтым прававым акце ўпершыню за ўвесь перыяд існавання беларускага савецкага заканадаўства аб дзяржаўным натарыяце было замацавана вызначэнне "дзяржаўнага натарыята" як органа, задачай якога з'яўлялася афармленне і засведчанне здзелак і дагавораў грамадзянска-прававога характару для прыдання ім пэўнасці. Згодна пункту а) артыкула 9 Палажэння аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР ад 7 чэрвеня 1950 года № 702 у выключную кампетэнцыю дзяржаўнага натарыята ўваходзіла сведчанне здзелак, якія мелі важнае сацыяльна-эканамічнае і прававое значэнне для развіцця грамадства, дзяржавы, асобнага грамадзяніна.

Грамадзянскі кодэкс Беларускай ССР са змяненнямі па стане на 1 студзеня 1951 года ўтрымліваў такі від формы здзелкі, як натарыяльная [6]. Згодна артыкулу 29 дадзенага Кодекса незахаванне патрабуемай законам формы выклікала наступствы несапраўднасці толькі ў тым выпадку, калі такія наступствы незахавання формы зделкі былі прама прадугледжаны ў законе. У сваю чаргу Грамадзянскі кодэкс Беларускай ССР прама ўказваў на несапраўднасць пэўных відаў здзелак у выпадку неўчынення іх у натарыяльнай форме. Не меней важнай з'яўляецца заўвага 1 да артыкула 132 Грамадзянскага кодэкса Беларускай ССР, згодна якой калі законам устаноўлена абавязковае натарыяльнае пасведчанне дагавора, дагавор, паколькі ў законе не ўстаноўлена іншае, лічыцца заключаным з часу яго натарыяльнага пасведчання. Згодна Грамадзянскаму кодэксу Беларускай ССР са змяненнямі па стане на 1 студзеня 1951 года натарыяльнаму пасведчанню пад страхам несапраўднасці падлягалі наступныя віды дагавораў: дагавор аб залогу збудаванняў не на землях працоўнага выкарыстання (арт. 92); перадача патрабавання, забяспечанага залогам збудавання (арт. 105); дагаворы дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў, кааператываў і іншых грамадскіх арганізацый з прыватнымі асобамі і арганізацыямі, акрамя 1) дагавораў на суму не больш за 1 000 рублёў,

2) здзелак па ўкладным, пазыкавым і камісійным аперацыям крэдытных устаноў і кааператыўных арганізацый, 3) дагавораў кантрактацыі, 4) дагавораў страхавання, 5) дагавораў, заключаных на аснове палажэння аб аўтарскім праве (арт. 132); дагавор дарэння на суму звыш 1 000 рублёў (арт. 140); дагавор аб найме дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў (арт. 155); дагавор куплі-продажу збудаванняў не на землях працоўнага выкарыстання, калі адным з бакоў у дагаворы з'яўляецца прыватная асоба ці прыватная арганізацыя (арт. 187); дагавор поўнага таварыства (арт. 334).

Дзяржаўныя натарыусы, акрамя пасведчання здзелак, таксама сведчылі даверанасці і завяшчанні. Натарыяльнае пасведчанне даверанасці патрабавалася ў тым выпадку, калі дзеянне павінна было быць учынена ў дачыненні да дзяржаўнага органа ці службовай асобы, за выключэннем выпадкаў, калі асаблівымі правіламі дапускалася іншая форма даверанасці. Натарыяльнаму пасведчанню падлягалі даверанасці на кіраванне маёмасцю (арт. 275), а таксама перадавер'е (арт. 282). Грамадзянскі кодэкс Беларускай ССР прадугледжваў абавязковае натарыяльнае пасведчанне завяшчання (арт. 466).

Такім чынам, заканадаўца таго часу звязваў незахаванне натарыяльнай формы здзелкі з яе несапраўднасцю і незаключанасцю, таму натарыяльнай форме здзелкі надавалася большае прававое значэнне, чым здзелцы, якая была выканана ў простай пісьмовай форме.

Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР ад 7 чэрвеня 1950 года № 702 на дзяржаўны натарыят таксама ўскладала выкананне такіх натарыяльных дзеянняў, як састаўленне актаў аб куплі збудаванняў з публічных таргоў, выдача пасведчання аб праве спадчыны і аб вымарачнасці маёмасці, прыняцце мер аховы маёмасці, якая засталася пасля памерлага, налажэнне забарон (арыштаў) на пабудовы і зняцце іх, учыненне выканаўчых надпісаў на дакументах, пасведчанне вернасці копій і выпісак з дакументаў, выкананне перакладаў і сведчанне вернасці перакладаў і копій дакументаў, выкананых на мовах народаў СССР і замежных мовах, пасведчанне сапраўднасці подпісаў на дакументах, сведчанне знаходжання грамадзяніна ў жывых, сведчанне часу прад'яўлення дакумента, перадача заяў грамадзян і ўстаноў другім грамадзянам і ўстановам, сведчанне падобнасці асобы з асобай на прадстаўленай ёй фатаграфічнай картцы, прыняцце ў дэпазіт для перадачы па прыналежнасці грашовых сум і каштоўных папер, здзяйсненне пратэстаў вэксаляў, пасведчанне неаплаты чэкаў, прыняцце на захаванне дакументаў, выдача пасведчанняў аб праве ўласнасці на долю агульнай маёмасці мужа і жонкі, набытай на працягу шлюбу.

У 1957 годзе дзяржаўныя натарыусы Беларускай ССР учынілі 501 411 натарыяльных дзеянняў, а ў 1958 годзе – 458 830, што на 42 381 натарыяльнае дзеянне менш, чым у папярэдні год. Нягледзячы на памяншэнне колькасці натарыяльных дзеянняў у асноўным за кошт змяншэння колькасці сведчання копій дакументаў і выпісак з іх, сапраўднасці подпісаў на дакументах, павялічылася колькасць засведчаных дагавораў аб прадастаўленні зямельных участкаў пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва, дагавароў аб адчужэнні збудаванняў, учыненых выканаўчых надпісаў, павялічыліся паступленні ад дзяржаўнай пошліны [7, л. 1].

Заканадаўства Беларускай ССР аб дзяржаўным натарыяце правам учыняць натарыяльныя дзеянні надзяляла дзяржаўных натарыусаў дзяржаўных натарыяльных кантор і службовых асоб выканаўчых камітэтаў раённых, гарадскіх, пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў працоўных. У артыкуле 6 Палажэння аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР ад 7 чэрвеня 1950 года № 702 былі замацаваны патрабаванні да кандыдатаў у дзяржаўныя натарыусы. Дзяржаўнымі натарыусамі маглі быць асобы, якія мелі вышэйшую ці сярэднюю юрыдычную адукацыю. У асобных выпадках натарыусамі маглі быць асобы, якія мелі агульную сярэднюю адукацыю і не менш за тры гады стажу працы ў якасці суддзяў, пракурораў, юрысконсультаў ці кансультантаў натарыяльных кантор. Дзяржаўны натарыус назначаўся на пасаду пасля праходжання стажыроўкі і паспяховай здачы спецыяльнага экзамена. Згодна артыкулу 5 Палажэння аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР ад 29 красавіка 1956 года № 232 на пасаду дзяржаўных натарыусаў маглі назначацца асобы, якія мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю [8]. Для маладых спецыялістаў, якія скончылі юрыдычныя ВНУ, была прадугледжана стажыроўка ў дзяржаўнай натарыяльнай канторы на працягу шасці месяцаў. Для немаладых спецыялістаў стажыроўка прадугледжана не была. Адзначаны прававы акт у параўнанні з папярэднім палажэннем не ўтрымліваў нормы, якая б абавязвала кандыдата ў дзяржаўныя натарыусы здаваць экзамен.

Пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР "Аб дапаўненнях і зменненнях Палажэння аб дзяржаўным натарыяце ад 29 красавіка 1956 года" ў 1958 годзе ў дадзены прававы акт былі ўнесены змены. Так, артыкул 5 палажэння быў дапоўнены наступнай нормай: "у выключных выпадках на пасаду натарыуса могуць быць назначаны асобы з сярэдняй спецыяльнай юрыдычнай адукацыяй, якія маюць вялікі стаж практычнай работы ў органах юстыцыі" [9, л. 91 – 92]. Неабходнасць прыняцця артыкула ў такой рэдакцыі тлумачыцца тым, што ў гэты перыяд забяспе-чыць поўнасцю дзяржаўны натарыят натарыусамі з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй было немагчыма. Увядзенне такой нормы замацавала права асоб, якія не мелі вышэйшай юрыдычнай адукацыі, працаваць у органах дзяржаўнага натарыята.

Такая неадназначнасць і ваганне ў прававым рэгуляванні заканадаўства аб дзяржаўным натарыяце ў дачыненні патрабаванняў да дзяржаўных натарыусаў сведчыць аб намерах заканадаўцы, з аднаго боку, забяспечыць дзяржаўны натарыят спецыялістамі з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй, якія б мелі належную практычную і тэарытычную падрыхтоўку. З другога боку, такія фактары, як нязначная роля дзяржаўнага натарыята ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, нізкі грамадскі і прававы статус дзяржаўнага натарыуса ў параўнанні са статусам іншых дзяржаўных служачых (у прыватнасці, суддзяў, праку-

рораў), адносна невялікая заработная плата, не спрыялі прыходу ў дзяржаўны натарыят высокакваліфікаваных кадраў. На 1 красавіка 1951 года эканоміку Беларускай ССР абслугоўвалі 85 дзяржаўных натарыусаў. Па палавой прыналежнасці: 13 – мужчын, 72 – жанчыны. Па наяўнасці адукацыі: 35 дзяржаўных натарыусаў мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю, 25 – сярэднюю спецыяльную юрыдычную адукацыю, 6 – скончылі аднагадовую юрыдычную школу, 22 – не мелі юрыдычнай адукацыі. Дзяржаўныя натарыусы, якія не мелі юрыдычнай адукацыі вучыліся ў Мінскай завочнай юрыдычнай школе ці ва Усесаюзным юрыдычным завочным інстытуце. Былі і такія дзяржаўныя натарыусы, у каго адсутнічала агульная сярэдняя адукацыя, таму яны не мелі магчымасці вучыцца завочна [10, л. 137 – 138]. На канец 1960 года эканоміку Беларускай ССР абслугоўвалі 83 дзяржаўныя натарыусы. Па палавой прыналежнасці: 12 – мужчын, 71 – жанчына. Па наяўнасці адукацыі: 51 дзяржаўны натарыус меў вышэйшую юрыдычную адукацыю, 22 – сярэднюю спецыяльную юрыдычную адукацыю. Толькі 2 з 83 дзяржаўных натарыусаў не мелі ні вышэйшай, ні сярэдняй спецыяльнай юрыдычнай адукацыі і не вучыліся завочна. Па стажу працы: 3 – менш 1 года; 11 – ад 1 да 5; 18 – ад 5 да 10; 51 – звыш 10 гадоў [11, л. 38 – 39].

Дзяржаўныя органы Беларускай ССР вялікае значэнне надавалі ўмацаванню свайго кадравага патэнцыялу. Адным з напрамкаў дзейнасці аддзела натарыяту і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР з'яўлялася арганізацыя падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі, павышэнне кваліфікацыі, падбор, расстаноўка, выхаванне кадраў дзяржаўных натарыусаў. У гэты перыяд сістэма павышэння кваліфікацыі дзяржаўных натарыусаў, якая склалася ў другой палове 1940-х гадоў, працягвала развівацца і ўдасканальвацца. Разам з праверанымі метадамі (рознатэрміновыя курсы, пастаяннадзеючыя семінары, сацыялістычныя спаборніцтвы, вытворчыя практыкі) укараняліся новыя. Характэрным прыкладам з'яўляецца атэстацыя дзяржаўных натарыусаў. Правядзенне атэстацыі спрыяла далейшаму ўмацаванню кадравага патэнцыяла дзяржаўнага натарыята, вывучэнню лепшых якасцей кожнага дзяржаўнага натарыуса, выяўленню недахопаў у дзейнасці дзяржаўных натарыяльных кантор, а таксама ў рабоце дзяржаўных натарыусаў па павышэнні свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню і дзелавой кваліфікацыі [12, л. 21 – 23]. Такім чынам, колькасць дзяржаўных натарыусаў за дзесяцігоддзе не змянілася, пры гэтым іх кваліфікацыя ўзрасла.

Згодна артыкулу 1 Палажэння аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР ад 7 чэрвеня 1950 года для ўчынення натарыяльных дзеянняў арганізуюцца дзяржаўныя натарыяльныя канторы. Сетка дзяржаўных натарыяльных кантор зацвярджалася Саветам Міністраў Беларускай ССР па прадстаўленні Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР. Наступнае Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце Беларускай ССР ад 29 красавіка 1956 года № 232 права зацвярджаць сетку дзяржаўных натарыяльных кантор замацавала за Міністрам юстыцыі Беларускай ССР. Аддзел натарыята і загсаў Беларускай ССР ажыццяўляў эканоміка-прававое рэгуляванне колькасці і займаўся аптымізацыяй размяшчэння дзяржаўных натарыяльных кантор. Пры вырашэнні пытання адкрыцця, пераводу, закрыцця дзяржаўнай натарыяльнай канторы прымаліся пад увагу наступныя фактары: запланаваныя паказчыкі прыбытковаці, колькасць насельніцтва ў раёне будучага размяшчэння, яго прамыслова-эканамічная значнасць, аддаленасць будучай дяржаўнай натарыяльнай канторы ад бліжэйшых дзяржаўных натарыяльных кантор, колькасць зваротаў жыхароў раёна і юрыдычных асобаў за натарыяльнымі паслугамі ў суседнія дзяржаўныя натарыяльныя канторы, ступень развіцця транспартнай сеткі раёна (асабліва наяўнасць чыгуначных дарог) [13, л. 23].

З Міністэрства юстыцыі СССР перыядычна прыходзілі ў Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР загады аб скарачэнні колькасці дзяржаўных натарыяльных кантор. Пасля тэлеграфнага ўказання Міністэрства юстыцыі СССР ад 25 мая 1955 года Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР загадам ад 26 мая 1955 года № 70 прыняло рашэнне аб закрыцці дзяржаўных натарыяльных кантор у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці, Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці, Церыхаўскім раёне Гомельскай вобласці, Чавускім раёне Магілёўскай вобласці, Міёрскім раёне Маладзечанскай вобласці. Прычына закрыцця заключалася ў тым, што ў гэтых дзяржаўных натарыяльных канторах выконвалася ў адзін рабочы дзень нязначная колькасць натарыяльных дзеянняў: ад пяці да сямі [14, л. 44].

Савет Міністраў Беларускай ССР неаднаразова патрабаваў ад мясцовых выканаўчых камітэтаў забяспечыць дзяржаўныя натарыяльныя канторы памяшканнямі прыгоднымі для прыёму наведвальнікаў. Тым не менш у 1953 годзе з 84 дзяржаўных натарыяльных кантор толькі адна мела 3 памяшканні, восем – па 2, шэсцьдзесят тры па 1, дванаццаць увогуле не мелі асобных памяшканняў [15, л. 158]. Адсутнасць асобнага памяшкання не давала магчымасці захоўваць натарыяльную тайну. Выканаўчыя органы ўлады прымалі меры па паляпшэнню матэрыяльна-тэхнічнага становішча дзяржаўных натарыяльных кантор шляхам выдзялення асобных і больш прасторных памяшканняў, рамонту тых памяшканняў, якія былі ўжо ў валоданні, пабудовы новых будынкаў народных судоў, у якіх некалькі памяшканняў адводзілася для размяшчэння дзяржаўных натарыусаў. Нягледзячы на такія захады, матэрыяльна-тэхнічнае становічша дзяржаўных натарыяльных кантор на працягу дадзенага перыяду знаходзілася ў нездавальняючым стане.

Структура кіравання дзяржаўным натарыятам у пачатку 1950-х гадоў выглядала наступным чынам: аддзел натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі СССР, аддзел натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР, упраўленні юстыцыі абласных выканаўчых камітэтаў абласных Саветаў народных дэпутатаў, старэйшыя дзяржаўныя натарыусы. Пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР у 1958 годзе было пераразмеркавана права назначаць, перамяшчаць і звальняць старэйшых натарыусаў, намеснікаў старэйшых натарыўсаў, дзяржаўных натарыусаў. Такое права атрымала Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР

(раней дзяржаўны орган мог толькі выказваць сваю згоду або нязгоду з выбранай кандыдатурай), а не начальнікі ўпраўленняў Міністэрства юстыцыі пры абласных Саветах дэпутатаў працоўных. Права назначаць, перамяшчаць, звальняць намеснікаў старэйшых натарыусаў, натарыусаў атрымалі старшыні абласных судоў, а не начальнікі ўпраўленняў Міністэрства юстыцыі пры абласных Саветах дэпутатаў працоўных. У выніку прыняцця такой пастановы, па-першае, Міністэрства юстыцыі Беларускай ССР стала адыгрываць ключавую ролю ў падборы старэйшых натарыусаў, па-другое, кіраўніцтва дзяржаўнымі натарыяльнымі канторамі перайшло ад упраўленняў Міністэрства юстыцыі пры абласных Саветах дэпутатаў працоўных да абласных судоў.

Дзяржаўнаму натарыяту надавалася роля рэгулятара эканамічнага развіцця Беларускай ССР шляхам прыдання здзелкам асаблівай прававой абароны. У 1950-я гады дзяржаўны натарыят беларускай дзяржавы развіваўся паступова, але павольна. У цэлым прычына такой тэндэнцыі заключалася ў тым, што эканоміка савецкага перыяду характарызавалася адсутнасцю прыватнай уласнасці, рынкавых адносін і прадпрымальніцтва, невысокім узроўнем матэрыяльнага забеспячэння і нізкай прававой свядомасцю насельніцтва. Адпаведна, ні органы дзяржаўнай улады, ні беларускае грамадства не мелі вялікай патрэбы ў натарыяльных паслугах, таму не былі зацікаўлены ў хуткім развіцці натарыята як дзяржаўнага органа, здольнага забяспечыць належную прававую ахову правоў фізічных і юрыдычных асоб, дзяржаўных інтарэсаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2005. – 48 с.
2. Работа органов юстиции в 2011 году // Юстиции Беларуси. – 2012. – № 2. – С. 3 – 15.
3. О некоторых вопросах нотариальной деятельности: Указ Президента Респ. Беларусь, 11 августа 2011 г., № 366 // Эталон-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2012.
4. Об упразднении Министерства юстиции Беларускай ССР: Указ Президиума Верховного Совета Белорус. ССР, 20 февраля 1960 года // Собр. законов, указов Президиума Верховного Совета Белорус. ССР, постановлений и распоряжений Совета Министров Белорус. ССР. – 1960. – № 4. – Арт. 38.
5. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 99. Народный комиссариат юстиции Белорус. ССР. – Оп. 5 (секретная), 1942 – 1960. – Д. 108. Приказы, инструкции, директивные указания Министерства юстиции СССР и постановления Пленума Верховного Суда СССР по отделу нотариата, 2 января 1949 года – 20 ноября 1949 года. – 112 л.
6. Гражданский кодекс Белорусской ССР с изм. по состоянию на 1 января 1951 года. – Минск: Изд-во Акад. наук Белорус. ССР, 1951. – 190 с.
7. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 142. Полугодовые отчеты работы отдела нотариата Министерства юстиции БССР и ноторганов, 1959. – 99 л.
8. Об утверждении Положения о Государственном нотариате Белорусской ССР: Постановление Совета Министров Белорус. ССР, 29 апреля 1956 г., № 232 // Собр. законов, указов Президиума Верховного Совета Белорус. ССР, постановлений и распоряжений Совета Министров Белорус. ССР. – 1956. – № 4. – Арт. 62.
9. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 137. Приказы, инструкции, директивные письма Министерства юстиции БССР, 28 дек. 1957 – 10 дек. 1958. – 124 л.
10. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 234. Постановления коллегии Министерства юстиции БССР, докладные записки и справки о состоянии работы с кадрами, 14 апреля 1951 года – 29 апреля 1951 года. – 259 л.
11. НАРБ. – Фонд. 188. Верховный суд БССР. – Оп. 3. (1944 – 1960, 1961 – 1965). – Д. 354. Статотчет о движении и составе работников судов, нотариата и адвокатуры БССР за 1960 год. – 2 л.
12. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 238. Приказы, инструкции, директивные указания Министерства юстиции СССР, 26 янв. 1952 года – 9 августа 1952 года. – 201 л.
13. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 126. Материалы о дислокации нотариальных контор, 1954 год. – 75 л.
14. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 128. Приказы, инструкции и директивные письма МЮ СССР и БССР, касающиеся отдела нотариата, 8 янв. 1955 года – 23 дек. 1955 года. – 69 л.
15. НАРБ. – Фонд. 99. – Оп. 5. – Д. 122. Приказы, инструкции и директивные письма МЮ СССР и БССР, касающиеся отдела нотариата, 5 янв. 1954 года – 17 дек. 1954 года. – 94 л.

*Паступіў 04.07.2012*

## DEVELOPMENT OF INSTITUTE OF NOTARIAL SYSTEM OF BELARUSIAN SSR IN THE 1950'S

***U. ANHELSKI***

*This article is devoted to the development of the institution of notarial system in Belarusian SSR in the 1950's. Archival sources and legal acts are analyzed, which regulate the organization and activity of state notarial bodies; the practice of their application is studied. Legal and social status of Soviet notary publics is characterized; competence, peopleware and material and technical support of state notary offices are investigated; quantity, structure and quality of accomplished notarial acts are revealed.*